**З вопыту рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа Актыўнага Грамадзяніна» у Дзяржаўнай установе адукацыі «Жарабковіцкая сярэдняя школа імя М.Г.Мінкевіча» Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці**

**Дата правядзення: 22.12.2023 г.**

**Блок «Я і Малая Радзіма»**
**Тэма «Куточак мілы Беларусі»**
**Удзельнікі:** навучэнцы 5-7 класаў

Мэта: фарміраванне цікавасці да гісторыі свайго роднага краю, паглыбленне ведаў пра вядомых гістарычных асоб ляхавіцкай зямлі, выхаванне пачуцця гонару за сваю малую Радзіму, стварэнне неабходных умоў для выхавання патрыятызму.

Калі глядзіш на карту свету, позірк міжвольна шукае месца, дзе жывеш. І тая маленькая, зусім непрыкметная кропачка ў вялікім свеце – родная сэрцу, бо гэта твая Радзіма… Менавіта роднаму краю і было прысвечана завочнае падарожжа «Куточак мілы Беларусі», якое прайшло 21 снежня 2023 года ў рамках рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта «ШАГ» для навучэнцаў 5-7 класаў.




У пачатку занятка навучэнцы спрабавалі знайсці адказы на пытанні: «Што такое Малая Радзіма?», «Якое значэнне яна мае ў жыцці кожнага чалавека?», «Адкуль на гербе Ляхавіч замак? », «Чаму ён не захаваўся да нашых дзён?». Затым яны здзейснілі віртуальнае падарожжа па вуліцах г. Ляхавічы, пазнаёміліся з паходжаннем іх назваў.



Настаўнік гісторыі Святлана Анатольеўна Пальчык расказала навучэнцам, якія культурна-гістарычныя помнікі занаходзяцца ў ваколіцах аграгарадка Жарабковічы. А наведаць, сапраўды, ёсць што – гэта і сядзібна-паркавы ансамль і капліца Рэйтанаў у Грушаўцы, сядзібна-паркавы ансамбль у аграгарадку Нача, касцёл Святога Юрыя ў в. Сваятычы, царква Святога Духа ў аграгарадку Падлессе, патапавіцкія валуны. Вучні з цікавасцю слухалі, дзяліліся адзін з адным уражаннямі, з задавальненнем выконвалі інтэрактыўныя заданні.





Не абмінулі ўвагай і славутых землякоў. Навучэнцы 7 класа падрыхтавалі кароткія паведамленні пра найбольш вядомых з іх: Алесь Бадак, Міхаіл Пташук, Генадз Цітовіч, Гаўрыіл Здановіч і іншыя.




Святлана Анатольеўна пазнаёміла з матэрыяламі музейнага вугалка «Яго імя носіць наша школа», які прысвечаны Міністру асветы БССР Міхаілу Гаўрылавічу Мінкевічу.

Паколькі блізяцца калядныя і навагоднія святы, усе навучэнцы напісалі на імправізаваных шарыках пажаданні сваёй малой Радзіме і ўпрыгожылі імі ялінку на дошцы.






Настаўнік гісторыі, класны кіраўнік 7 класа
Жарабковіцкай сярэдняй школы імя М.Г.Мінкевіча
Ляхавіцкага раёна Святлана Анатольеўна Пальчык